

«ЗОРНЫ» КАШАЛЁК АНАТОЛЯ ЯРМОЛЕНКІ

Сямейная газета

ДЗЕ Ў БЕЛАРУСІ ВУЧАЦЬ ФАРБАВАЦЬ ЯЙКІ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЛІПЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 138 (29005)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Уступная кампанія ўступае ў стадыю завяршэння. Практычна завяршылася залічэнне на бюджэтныя месцы, зараз праводзіцца прыём на платнай аснове ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Пачаты прыём дакументаў у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на бюджэтныя месцы. Дзяржаўная камісія, вядома ж, скажа сваё слова аб уступнай кампаніі, але пакуль можна канстатаваць, што яна праходзіць у штатным рэжыме. Змена методыкі падліку балаў на ЦТ дазваляе больш аб'ектыўна ацаніць узровень ведаў абітурыентаў. Ацэнкі, атрыманыя сёлета на тэсціраванні, больш набліжаны да тых вынікаў, якія школьнікі мелі ў сваіх установах адукацыі. Гэта значыць, цяпер кожны школьнік можа параўнаць, што ён засвоіў, што — не, на якія пытанні адказаў ці не адказаў, і супаставіць ацэнку, якую атрымаў на ЦТ, з ацэнкай у школе».*




# КРАСА І СІЛА...



**МСЦІСЛАЎСКАЯ крыніца пад назвай «Кагальны калодзеж» знаходзіцца пад замкавай гарою, яна — помнік сакральнай культуры і неад'емная частка мясцовага ландшафту. Апроч таго, гістарычная славутасць сярэдняевечнага горада. Сапраўды, гісторыя, якая нагадвае легенду, а таксама якасць пітной вады прываблівацюць гараджан і турыстаў, якіх з кожным годам тут усё больш. Сваю назву крыніца атрымала ад яўрэйскага слова «кагал», што азначае — грамадскі, агульны. Яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя яўрэі-вадавозы (у той час Мсціслаў быў напалову заселены людзьмі гэтай нацыянальнасці) набіралі з крыніцы ваду і прадавалі яе жыхарам. На жаль, пасля апошняй вайны і да пачатку двухтысячных крыніца прыйшла ў занядбанне, але дзякуючы намаганням мясцовай улады і жыхароў горада «калодзеж» быў адноўлены. З «Кагальнага», між іншым, бярэ пачатак ручай Здаравец, што жывіць раку Віхру, якая, у сваю чаргу, з'яўляецца буйным прытокам Сожа.**

**З навуковых крыніц вядома, што Мсціслаўшчына з'яўляецца важным этнагістарычным рэгіёнам Пасожжа. Да нашага часу захаваліся народныя строі, якія былі адметнасцю побыту жыхароў сярэдзіны XIX і пачатку XX стагоддзя. На падставе каштоўных экспанатаў раённы Дом рамёстваў адрадзіў рэгіянальны строй, каб разумець самабытную культуру, характар і светаўспрыманне сваіх майстравітых папярэднікаў. Такі ўбор — сапраўдны вытак, што злучае мінуўшчыну і сучаснасць, візітка Мсціслаўшчыны. На фота дваццацігадовая патомная мсціслаўчанка Дар'я Антонава дэманструе дзявочы строй і гэтым паказвае, як выглядалі маладзіцы, калі віравала жыццё павятовага горада на магілёўска-смаленскім памежжы. Трэба зазначыць, что Дар'я мае самае непасрэднае дачыненне да народнай культуры — яна займаецца харэаграфіяй, вучыць дзяцей мясцовым традыцыйным танцам, выступае ў ролі мадэлі мясцовых куцюр'е. І марыць аб тым, каб традыцыя надзяваць святочны народны строй вярнулася.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў чэрвені склала Br1080,5 і вырасла ў параўнанні з мінулым годам на 6,7 %.
- **Учора ў Браслаўскім раёне ўшанавалі першага камбайнера-двухтысячніка Сяргея Зелянкевіча** *(на фота)*.



- Мінскі завод колавых цягачоў 84 % прадукцыі пастаўляе на экспарт.
- **У беларускіх школах прапануецца ўвесці курс «Сем'язнаўства».**

ISSN 1990 - 763X

Месца дзеяння

# САКРЭТ ШАМБАЎ

### Як маладыя сужэнцы займаюцца адраджэннем вёскі ў Хоцімскім раёне

**Размова ідзе пра вёску Горня, што за 12 кіламетраў ад Хоцімска. Сёння тут жыве каля трох дзясяткаў чалавек. І калі б не Андрэй і Алена Шамбы, яе можна было б смела лічыць бесперспектыўнай. Гэта пара — той самы выпадак, калі кажуць, што шлюбы заключаюцца на нябёсах. Пра іх рамантычную гісторыю хто толькі не пісаў. Але яны настолькі няўрымслівыя, што за падзеямі іх жыцця толькі паспявай сачыць. А іх каханне каштуе таго, каб пра яго паўтарыць. Без гэтага будзе цяжка зразумець іх учынкі.**

## З Масквы ў Горню

Алена — карэнная масквічка, у вёску наведвалася толькі ў дзяцінстве — ездзіла з сяброўкай да яе бабулі. Ад той рускай вёсачкі да Горні некалькі кіламетраў, але гэта не перашкаджала дзяўчынкам бегаць туды на дыскатэку. Там і пазнаёмілася з Андрэем. Але адразу ж не разгледзела ў ім свайго нарачонага. Вярнулася ў Маскву і на нейкі час забылася — вывучылася, выйшла замуж, пайшла працаваць у «Масэнерга». Здавалася, усё для шчасця ёсць, але засталася нейкая незадаволенасць. І менавіта муж ёй аднойчы прапанаваў паглядзець фільм «Сакрэт». Сэнс яго — кожны каваль свайго шчасця. Калі жадаеш нешта змяніць, слухай сэрца. І яна паслухала. Адправіла эсэмэску са словам «Прывітанне» на адрас таго самага хлопца, з якім «запальвала» ў вясковым клубе. І сэрца забілася, калі тэлефон хутка адгукнуўся: «Прывітанне!»

СТАР. 4



Мясцовая славутасць — вершнік на кані.